

# Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі

## Да 70-годдзя з дня нараджэння

Мастацтва Міхаіла Паўлавіча Дрынеўскага сапраўды народнае, беларускае: ён адносіцца менавіта да тых дырыжораў, якія пастаянна і з усёй шчырасцю сваёй вялікай душы папулярызуюць народную музыку і творы нацыянальных кампазітараў. Высокі ўзровень майстэрства і яркі эмацыянальны ўздым дазваляюць музыканту ствараць у глядзельнай зале паэтычна прыўзняты і натхнёны настрой, пераканаўча даносіць да слухачоў змест твора.

Нарадзіўся М. Дрынеўскі ў вёсцы Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Шлях Міхаіла Паўлавіча ў музыку пачаўся рана: гэтаму спрыялі цікавыя музычныя вечары, якія наладжваў бацька. Акрамя таго, жыхары роднай вёскі заўжды славіліся сваёй працавітасцю і песнямі. Будучую прафесію харавога дырыжора ён асвойваў з маленства: ужо ў 13 гадоў хлопцу даручылі кіраўніцтва калгасным хорам. М. Дрынеўскі вучыўся ў Гомельскім музычным вучылішчы на аддзяленні харавога дырыжыравання, а потым у Беларускай кансерваторыі, пасля заканчэння якой (1968, клас Г. Зелянковай) яго запрасілі працаваць хормайстрам у Дзяржаўны народны хор БССР. Яшчэ ў час навучання ў кансерваторыі руплівы і працавіты Міхаіл Паўлавіч не мог існаваць без практыкі, без уласнага хору: свой вольны час ён аддаваў капэле Дома культуры Мінскага трактарнага завода. Больш за дзесяць гадоў слесары, токары і зборшчыкі прадпрыемства пад кіраўніцтвам М. Дрынеўскага суладна выконвалі складаныя партытуры, гастралявалі па краіне, станавіліся пераможцамі конкурсаў і фестываляў.

З 1975 года Міхаіл Паўлавіч з'яўляецца мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Дзяржаўнага народнага хору БССР (зараз Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча). Вялікую ўвагу ён надае рэпертуару хору, аснову якога складаюць народныя песні, якія, па меркаванні дырыжора, найбольш ярка раскрываюць духоўнае багацце і маральную чысціню беларускага нацыянальнага характару ў самых розных яго праяўленнях. Больш таго, пад кіраўніцтвам М. Дрынеўскага калектыў імкнецца максімальна пашырыць свой рэпертуар: выконвае песні сучасных кампазітараў (Л. Захлеўнага, І. Лучанка, А. Атрашкевіч і інш.), духоўную музыку, апрацаваныя народныя песні, на іх аснове стварае ўласныя стылізаваныя кампазіцыі, звяртаецца да творчасці самадзейных кампазітараў.

*Працяг на с. 28*

*Працяг. Пачатак на с. 2 вокладкі.*

# Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі

***Да 70-годдзя з дня нараджэння***

Канцэртная праграма народнага хору — гэта сапраўды маляўнічае відовішча, якое спалучае песенна-харавыя, інструментальныя і танцавальныя жанры. Тэмперамент танцавальнай групы, высокі ўзровень тэхнікі валодання галасам, які дазваляе ствараць яркія музычныя вобразы з глыбокім пранікненнем у стыль твора, выканаўчае майстэрства артыстаў аркестра, маляўнічыя і арыгінальныя касцюмы робяць кожнае выступленне калектыву цэласным эмацыянальным спектаклем жыцця беларускага народа.

Акрамя кіраўніцтва народным хорам Міхаіл Паўлавіч аддае шмат сіл грамадскай дзейнасці: з'яўляецца старшынёй праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў, старшынёй і членам журы многіх свят песні, харавых конкурсаў і фестываляў як народнай, так і акадэмічнай музыкі, займаецца педагагічнай дзейнасцю — вучыць мастацтву харавога дырыжыравання (прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, 1992). Міхаіл Дрынеўскі — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1978), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1982), народны артыст БССР (1987). Яго калектыў пастаянна выязджае з шэфскімі канцэртамі, гастралюе па рэспубліцы і за яе межамі, робіць запісы на радыё і тэлебачанні. Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі — выдатны дырыжор, таленавіты кіраўнік, клопатамі якога выступленні народнага хору адзначаны гарантыяй высокай якасці.

**К. Дз. Варанько,** *вядучы бібліёграф*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*